# Мова вучыць чалавечнасці

**А. І. Татарчук,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі
СШ № 10 г. Пінска

Перш чым арганізаваць работу па вывучэнні мовы на павышаным узроўні, трэба вызначыць ступень падрыхтоўкі вучняў і прадугледзець дыферэнцаваныя метады і прыёмы навучання, пашырыць або скараціць тэарэтычны матэрыял, больш увагі надаць авалоданню практычнымі ўменнямі і навыкамі.

Сярод мноства метадаў і прыёмаў рэалізацыі дыферэнцыраванага падыходу на ўроках практыкую наступныя:

- рознаўзроўневае выкладанне матэрыялу: цэласны выклад асноўнага, затым дэталізацыя і канкрэтызацыя па частках;
- індывідуальнае апытванне (па загадзя прапанаваных вучню пытаннях, па плане);
- дыферэнцыраваны кантроль (узроўневыя заданні, заданні з выбарам);
- выкарыстанне на адным этапе ўрока заданняў рознага зместу і ўзроўню складанасці.

На прапанаваным уроку акцэнт робіцца на выхаваўчым аспекце: вучням прапануецца ацаніць паводзіны ўдзельнікаў рэальных жыццёвых сітуацый, выкарыстоўваючы сказы з пабочнымі канструкцыямі.

**Урок беларускай мовы ў 10 класе (павышаны ўзровень)**

**Тэма.** Сінтаксічныя прыметы сказаў з пабочнымі канструкцыямі, знакі прыпынку.

**Мэта:** сістэматызаваць веды пра пабочныя словы, спалучэнні і сказы, іх значэнні.

**Задачы:**

- выпрацоўваць уменні вызначаць сінтаксічныя прыметы і асаблівасці будовы сказаў з пабочнымі канструкцыямі, адрозніваць пабочныя канструкцыі ад членаў сказа; правільна ставіць і тлумачыць знакі прыпынку;
- фарміраваць уменне карыстацца пабочнымі словамі як сродкамі сувязі сказаў і частак тэксту, рабіць сінтаксічны разбор сказаў з пабочнымі канструкцыямі;
- выхоўваць патрыятычныя пачуцці, гуманізм, міласэрнасць.

**Абсталяванне:** карткі з заданнямі, выказванні беларускіх паэтаў і пісьменнікаў для афармлення дошкі, падручнік.

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны момант**

**2. Праверка дамашняга задання па тэме «Зваротак» (франтальная работа і індывідуальныя заданні на картках)**

**Варыянт 1**

***1. Падкрэсліце звароткі. (2 балы)***

1) Дарагія дзеці! Любіце кнігу. 2) І будзе, дружа, у доме шчасце, пакуль ёсць добры свет сяброў! 3) Маці, не сорамна анідзе сынам тваім назвацца!

***2. Што такое зваротак? (4 балы)***

***3. Устаўце прапушчаныя літары, расстаўце знакі прыпынку. Падкрэсліце звароткі. (6 балаў)***

1) Эх, луг шырокі Як жывы ты, праменем сонейка заліты. 2) Сп…вай ты Беларусь у радасці спявай! 3) Слаўся ж восень дарамі багатымі. 4) Гаспадыня пусці а…пачыць чалавека! 5) Адышло ад нас ты лета.

***4. Перабудуйце сказы так, каб дзейнікі сталі зваротнамі. (8 балаў)***

Музыка іграе вясёлыя песні. Спіць маці-зямля пасля дзённай зморы. Як у люстэрка, глядзіцца ў прыроду чалавек і бярэ ад яе і душэўнасць, і ласку, і мудрасць. Дзед раскажа казку ўнукам.

***5. Складзіце тэкст (3–4 сказы) гутарковага стылю «Вясна прыйшла», выкарыстоўваючы звароткі. (10 балаў)***

**Варыянт 2**

***1. Падкрэсліце звароткі (2 балы)***

1) Дзень добры вам, лясы і далі… 2) Крынічкі, ціхія крынічкі, як я люблю вас, як люблю! 3) Родная мова, цудоўная мова! Ты нашых думак аснова!

***2. Якія знакі прыпынку ставяцца пры звароткў, калі ён знаходзіцца ў пачатку сказа?(4 балы)***

***3. Устаўце прапушчаныя літары, расстаўце знакі прыпынку. Падкрэсліце звароткі (6 балаў)***

1) Бывайце здаровы л…сы і дубровы. 2) Эх ты лета гарачае бурнае! 3) Справ…длівасць Янка паважае той, хто сам сумленны. 4) О Радзіма табою напоўнена сэрца да краю. 5) Ідзі ў чыстае ты пол… градавая хмара.

***4. Перабудуйце сказы так, каб дзейнікі сталі зваротнамі. (8 балаў)***

Бабуля расказала нам цікавую казку. Сонейка не шкадуе нам святла і цеплыні. Міша гуляе ў хакей. Восень славіцца дарамі багатымі.

***5. Складзіце тэкст (3–4 сказы) гутарковага стылю «Вясна прыйшла», выкарыстоўваючы звароткі. (10 балаў)***

– Як вы думаеце, якія веды і ўменні вы ўдасканальвалі пры выкананні дамашняга задання па тэме «Зваротак? *(Адказы вучняў.)*

**3. Падрыхтоўка да вывучэння новага матэрыялу**

Што трэба чалавеку
У наш трывожны век?
Каб сёння з чалавекам сустрэўся чалавек.
Каб працягнуў ён руку
І да яго пайшоў.
І ў чалавеку друга
Каб для сябе знайшоў.

(М. Ясень)

– Вечнасць і чалавечнаць не старэюць з часам. Камп’ютары, безумоўна, аблягчаюць працу людзей. Аднак ніякі камп’ютар не заменіць ласкавы пацалунак мамы, мяккі позірк настаўніцы, цёплую далонь сябра. Таму маё пажаданне сёння заключаецца ў словах У. Караткевіча: «Будзь удзячны за дабро, якое табе зрабілі, не жадай людзям таго, чаго не жадаеш сабе, будзь роўны з роўнымі, смелы з дужымі, паблажлівы да слабых, літасцівы да братоў нашых меншых. Інакш кажучы, будзь Чалавекам».

– Напярэдадні некаторыя вучні атрымалі творчае заданне: апісаць пэўную жыццёвую сітуацыю і даць ацэнку паводзінам герояў згодна з тэмай «Без чалавечнасці не будзе вечнасці». Што ў іх атрымалася, мы даведаемся ў канцы ўрока.

***Сітуацыя 1.*** Стары чалавек у сям’і.

***Сітуацыя 2.*** Чалавек ляжыць на тратуары.

***Сітуацыя 3.*** Бескарыслівая дапамога бяздомнам.

**4. Паведамленне тэмы і мэты ўрока, пастаноўка задач**

Аналіз сказаў, запісаных на дошцы:

а) Заўсёды ж здаецца, што ў родным краі і грыбы вышэйшыя, і ягады буйнейшыя, а хлеб мякчэйшы.

б) З таго часу ў мястэчку, здаецца, нічога і не змянілася.

- ✓ Ці адрозніваюцца сказы па будове? Вызначце сінтаксічную ролю слова **здаецца.**
- ✓ Які вывад можна зрабіць? (У першым сказе слова *здаецца* – выказнік, а ў другім – не член сказа, а пабочнае слова, бо яно не ўступае з іншымі членамі сказа ні ў злучальную, ні ў падпарадкавальную сувязь, выражае адносіны гаворачага да выказваемай думкі).

*Настаўнік разам з вучнямі фармулюе мэту і задачы ўрока.*

**5. Актуалізацыя ведаў**

– Давайце ўзновім і сістэматызуем атрыманыя раней веды па тэме. Адкрыце, калі ласка, падручнік на с. 205. Успомніце, якія словы называюцца пабочнымі. *(Пабочнымі называюцца граматычна не звязаныя з членамі сказа словы, якія выражаюць адносіны гаворачай асобы да зместу выказвання.)*

– Карыстаючыся схемамі, раскажыце пра адасабленне пабочных слоў.

**[ПС, …] [ …, ПС, …] [ …, ПС]**

– Часта мы сустракаем паняцце пабочныя канструкцыі. Што гэта такое? *(Словы, словазлучэнні і сказы.)*

– Зараз мы паспрабуем размежаваць сказы з пабочнымі словамі, словазлучэннямі і сказамі.

<u>Заданне.</u> Абазначце сказы з пабочнымі словамі (А), словазлучэннямі (Б) і сказамі (В). Адказ запішыце ў выглядзе шыфра «лічба – літара».

1) Я, скажу шчыра, узрадаваўся сустрэчы з роднымі мясцінамі. 2) Дык чаго ж ты плакала? Можа, пакрыўдзіў хто? 3) Узгоркі змяняліся лагчынамі, пасля зноў ішло поле, і, нарэшце, магутная сцяна старога лесу вырасла як з-пад зямлі. 4) Адна гульня пераходзіла ў другую. Словам, дзеці не сумавалі. 5) Верасень быў ціхі, цёплы і, на шчасце, без дажджоў. 6) Шчырай размовы, як

я спадзяваўся, не атрымалася. 7) Раней тут, казалі старыя, стаяў княжацкі палац. 8) На мой розум, гэта бясспрэчная праўда.

Самаправерка

| № | Адказ | № | Адказ | № | Адказ | № | Адказ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | б | 3 | а | 5 | а | 7 | в |
| 2 | а | 4 | а | 6 | в | 8 | б |

– Растлумачце, па якіх прыметах вы адрознівалі пабочныя словы і словазлучэнні ад пабочных сказаў. *(Пабочныя словы суадносяцца са словамі, выражанымі назоўнікам, займеннікам, прыслоўем, пабочныя словазлучэнні – са словазлучэннямі, у якіх ёсць галоўны і залежны кампаненты, а пабочныя сказы па сваёй структуры нагадваюць сказы, у якіх ёсць граматычная аснова.)*

**Заўвага!** Пабочныя словы, якія суадносяцца з дзеясловамі, можна лічыць пабочнымі сказамі. Яны па сваёй структуры нагадваюць аднасастаўныя неразвітыя сказы.

**6. Інфармацыйны блок**

Праца з табліцай пр. 268. Разгледзьце табліцу. Параўнайце дадзеныя сказы і адкажыце на пытанне: як можна вызначыць, ці з’яўляецца слова пабочным? *(Калі пры пропуску слова структура сказа не парушаецца, то перад намі пабочная канструкцыя, калі ж пропуск слова (слоў) вядзе да разбурэння сказа, то апушчаны член сказа.)*

**7. Замацаванне новага матэрыялу**

Самастойная работа. Запішыце сказы, вызначце, у якіх з іх – пабочныя словы, у якіх тыя ж словы выконваюць функцыю члена сказа, падкрэсліце адпаведна.

1) Дождж, **відаць,** зацягнуў надоўга. Дарога з узгорка была добра **відаць.**

2) Садок быў, **праўда,** невялікі. **Праўда** даражэйшая за грошы.

**Запомніце!** Словы **нават, таксама** і спалучэнне **на першы погляд** ніколі не бываюць пабочнымі.

**8. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія**

– Напрыканцы я хачу, каб вы прааналізавалі набытыя веды і сваю працу на ўроку і закончылі фразы, якія пачынаюцца пабочнымі словамі:

- ✓ На маю думку, …
- ✓ Сапраўды, …
- ✓ Безумоўна, …
- ✓ На шчасце, …
- ✓ Хутчэй за ўсё, …
- ✓ Напэўна, …
- ✓ Па сутнасці, …
- ✓ Па-мойму, …
- ✓ Шчыра кажучы, …
- ✓ Магчыма, …
- ✓ К майму задавальненню, …

- ✓ На маё здзіўленне, …
- ✓ Адным словам, …
- ✓ Карацей кажучы, …
- ✓ Бясспрэчна, …
- ✓ Відавочна, …
- ✓ Ва ўсякім выпадку, … .